

Urzędy pracy w Polsce – jak mogą ci pomóc? – język białoruski

# Цэнтры занятасці ў Польшчы - як яны могуць вам дапамагчы?

**Раённыя цэнтры занятасці (PUP)** аказваюць дапамогу асобам, зарэгістраваным як беспрацоўныя або шукаючыя працу.

Замежныя грамадзяне, якія страцілі працу, маюць права зарэгістравацца ў павятовым цэнтры занятасці ў якасці беспрацоўных, калі ў іх ёсць адзін з ніжэйазваных статусаў знаходжання:

- статус бежанца,
- дазвол на пастаяннае знаходжанне,
- дазвол на знаходжанне доўгатэрміновага рэзідэнта Еўрапейскага саюза,
- дазвол на часовае знаходжанне, прадастаўленае для выканання работы ў прафесіі, якая патрабуе высокай кваліфікацыі,
- дазвол на часовае знаходжанне, прадастаўленае для правядзення навуковых даследаванняў,
- дазвол на часовае знаходжанне, прадастаўленае ў сувязі з наяўнасцю доўгатэрміновага віду на жыхарства ЕС у іншай дзяржаве садружнасці,
- дазвол на знаходжанне па гуманітарных меркаваннях або дазвол на талераванае знаходжанне,
- у сувязі з карыстаннем у Польшчы часовай або дадатковай абаронай,

- дазвол на часовае знаходжанне для члена сям'і грамадзяніна Польшчы ці штамп ў праязным дакуменце, які пацвярджае падачу заявы аб выдачы дазволу на часовае, пастаяннае знаходжанне або знаходжанне доўгатэрміновага рэзідэнта ЕС, калі непасрэдна перад падачай заявы меў месца дазвол на часовае знаходжанне,
- дазвол на часовае знаходжанне і работу або віза, выдадзеная для выканання работы пры ўмове, што непасрэдна перад рэгістрацыяй у якасці беспрацоўных яны ўвесь час працавалі ў Польшчы на працягу не менш за 6 месяцаў,

а таксама адпавядаюць умовам, акрэсленым у законе аб садзейнічанні занятасці і ўстановах рынку працы.

## Правы замежных грамадзян, зарэгістраваных як беспрацоўныя:

Пасля рэгістрацыі гэтыя асобы будуць мець доступ да **выплат і паслуг рынку працы**, г. зн.:

- дапамогі па працаўладкаванню,
- прафесійнага кансультавання і прафесійнай інфармацыі,
- дапамогі ў актыўным пошуку работы,
- ўдзелу ў трэнінгах, арганізаваных цэнтрам занятасці.

**Дапамога па працаўладкаванню - гэта атрыманне прапаноў**, якія затым публікуюцца ў офісах цэнраў занятасці і ў **цэнтральнай базе вакансій** (oferty.praca.gov.pl/portal/index.cbop).
Супрацоўнікі цэнтра занятасці, з аднаго боку, аказваюць дапамогу беспрацоўным і тым, хто шукае працу, у атрыманні адпаведнай работы, а з другога - дапамагаюць работадаўцам ў прыцягненні адпаведных супрацоўнікаў, адпраўляючы да іх людзей, якія лепш за ўсё адпавядаюць крытэрыям, акрэсленым у прапанове. Чыноўнікі ініцыююць і арганізуюць сустрэчы беспрацоўных і суіскальнікаў з работадаўцамі ў рамках біржаў і кірмашоў вакансій. Таксама важнай задачай з'яўляецца інфармаванне кліентаў аб бягучай сітуацыі і чакаемых змяненнях на мясцовым рынку працы, а таксама інфармаванне беспрацоўных аб іх правах і абавязках, якія ўзнікаюць у выніку рэгістрацыі ў цэнтры занятасці.

**Прафесійнае кансультаванне** заключаецца ў аказанні супрацоўнікам Цэнтра занятасці дапамогі ў вырашэнні прафесійных праблем людзям, якія звяртаюцца за такой падтрымкай. Вы можаце атрымаць дапамогу па наступных пытаннях:

- выбар або змяненне прафесіі,
- планаванне прафесійнай кар'еры,
- павышэнне кваліфікацыі,
- вызначэнне сваіх кампетэнцыі і інтарэсаў,
- планаванне прафесійнага развіцця.

Акрамя таго, асобы, зарэгістраваныя як беспрацоўныя, падлягаюць медыцынскаму страхаванню і, такім чынам, атрымліваюць **бясплатную медыцынскую дапамогу.**
Для замежных грамадзян, якія маюць дазвол на часовае знаходжанне і работу (так званы адзіны дазвол) і візу, выдадзеную для выканання работы, удзел у навучанні не будзе ўключаць у сябе фінансавую дапамогу, звязаную з атрыманнем дадатковай адукацыі ў рамках паслядыпломнага навучання і трэнінгаў. Зарэгістраваны замежны грамадзянін можа таксама мець права на **дапамогу для беспрацоўных**, калі знаходзіцца ў Польшчы на падставе аднаго з вышэйпералічаных дазволаў на знаходжанне, а калі таксама выконваў работу і аплачваў ўзносы ў Фонд занятасці на працягу 365 дзён у перыяд 18 месяцаў да даты рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага.

## Як зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага або суіскальніка?

Вы павінны звярнуцца ў раённы цэнтр занятасці, які адпавядае месцу вашай пастаяннай або часовай рэгістрацыі, а калі ў вас няма рэгістрацыі – у цэнтр занятасці павяту, у якім вы знаходзіцесь. Вы можаце загадзя перадаць неабходныя даныя ў адпаведны цэнтр занятасці праз электронную сістэму рэгістрацыі, якая даступная на сайце praca.gov.pl. Пасля гэтага цэнтр занятасці (UP) усталёўвае крайні тэрмін, не больш за 7 рабочых дзён з моманту перадачы даных, для таго, каб падаць усе неабходныя дакументы і ажыццявіць рэгістрацыю. У выпадку, калі чалавек не з'яўляецца ва ўстаноўлены тэрмін, яго даныя выдаляюцца з сістэмы UP.

**Памятайце!** Статус беспрацоўнага набываецца з дня звароту ў цэнтр занятасці, пацвярджэння ўласнаручным подпісам прадстаўленых даных і пдачы (у прысутнасці работніка цэнтра і пад пагрозай крымінальнай адказнасці за дачу ілжывых паказанняў) заявы аб праўдзівасці даных і азнаямленні з умовамі захавання такога статусу.
Калі ў вас ёсць бяспечны электронны подпіс (podpis elektroniczny) або пацверджаны давераны профіль (profil zaufany), вы можаце зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага праз сайт praca.gov.pl.

**Вы можаце зарэгістравацца АЛЬБО як беспрацоўны (у тым ліку з доступам да медыцынскага абслугоўвання і дапамогі па беспрацоўю) АЛЬБО ў якасці суіскальніка працы.**

## Рэгістрацыя ў якасці суіскальніка

Замежныя грамадзяне, якія не выконваюць умовы, неабходныя для рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных, могуць зарэгістравацца ў якасці суіскальнікаў. Пасля гэтага яны атрымліваюць доступ да паслуг, якія прадстаўляюцца цэнтрамі занятасці, у тым ліку да дапамогі па працаўладкаванню і прафесійнага кансультавання.

Паслугі, даступныя для асобаў, не зарэгістраваных у раённым цэнтры занятасці

Замежныя грамадзяне, якія маюць дазвол на часовае знаходжанне і работу або візу, выдадзеную для выканання работы, або іншыя дазволы на часовае знаходжанне - незалежна ад таго, будуць ці не будуць яны зарэгістраваныя як беспрацоўныя альбо суіскальнікі, - могуць карыстацца:

- агульнадаступнымі паслугамі па працаўладкаванню, якія прадстаўляюцца цэнтрам занятасці (UP);
- інфармацыяй аб прафесіях, рынку працы і магчымасцях навучання і трэнінгаў, прапанаваных цэнтрам занятасці (UP);
- інфармацыяй і электроннымі базамі даных, якія выкарыстоўваюцца для атрымання навыкаў пошуку работы і самазанятасці.

Права карыстання выплатамі і паслугамі рынку працы залежыць ад віду статуса знаходжання, якім валодае замежны грамадзянін, і распаўсюджваецца толькі на тэрмін яго дзеяння. Пасля анулявання візы або дазволу на часовае знаходжанне або па заканчэнні тэрміну дзеяння гэтых дакументаў замежны грамадзянін губляе статус беспрацоўнага або суіскальніка.

**Карысныя спасылкі:**

oferty.praca.gov.pl

praca.gov.pl/eurzad/index.eup#/panelOgolny

psz.praca.gov.pl/rynek-pracy/bazy-danych/doradca-2000

zielonalinia.gov.pl/web/zielona-linia/-/jak-sie-zarejestrowac-w-powiatowym-urzedzie-pracy-32331 →

UNIA EUROPEJSKA
FUNDUSZ AZYLU, MIGRACJI I INTEGRACJI

POLSKIE FORUM MIGRACYJNE

*Бяспечная гавань*
*(Bezpieczna przystań)*
Праект сумесна фінансуецца Нацыянальнай праграмай Фонду прытулку, міграцыі і інтэграцыі

Fundacja Polskie Forum Migracyjne
ul. Szpitalna 5/14, Warszawa
+48 692 913 993
info@forummigracyjne.org
**www.forummigracyjne.org**

Выключная адказнасць за выказаныя думкі ляжыць на аўтары, і Еўрапейская камісія, а таксама Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі не нясуць адказнасці за тое, як выкарыстоўваецца уступленая інфармацыя.